# Sergej Važnik

# Belaruskaâ mova ŭ ìntèrnèce

Acta Neophilologica 8, 79-89

2006

Artykuł został opracowany do udostępnienia w internecie przez Muzeum Historii Polski w ramach prac podejmowanych na rzecz zapewnienia otwartego, powszechnego i trwałego dostępu do polskiego dorobku naukowego i kulturalnego. Artykuł jest umieszczony w kolekcji cyfrowej bazhum.muzhp.pl, gromadzącej zawartość polskich czasopism humanistycznych i społecznych.

Tekst jest udostępniony do wykorzystania w ramach dozwolonego użytku.

MUZEUM HISTORII POLSKI

UWM Olsztyn Acta Neophilologica, VIII, 2006
ISSN 1509-1619

**Сергей Важник**
Białoruski Uniwersytet Państwowy
w Mińsku

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА Ў ІНТЭРНЭЦЕ

## 1. Праграмнае забеспячэнне і Інтэрнэт-рэсурсы беларускай мовы

У сувязі з тым, што камп'ютэры і камп'ютэрныя сеткі сталі сёння асноўным інструментам захавання, апрацоўкі і распаўсюджвання інфармацыі, прадстаўленай у выглядзе тэкставых дакументаў, большасць моў, у тым ліку і беларуская, атрымалі камп'ютэрную форму свайго існавання (адмысловы электроннамашынны выгляд). Прычым апошнюю нельга звесці ні да вуснай, ні да пісьмовай формы [Совпель 2002: 7].

У Беларускім дзяржаўным універсітэце (супрацоўнікамі лабараторыі інтэлектуальна-інфармацыйных сістэм ФПМІ БДУ і лабараторыі прыкладной лінгвістыкі філфака БДУ) былі распрацаваны наступныя эфектыўныя прамысловыя сістэмы аўтаматычнай апрацоўкі тэкставых дакументаў: карэктар тэкстаў беларускай мовы, суадносны з Microsoft Word; сістэма аўтаматычнага рэферыравання тэкстаў; сістэма беларуска-рускага і руска-беларускага машыннага перакладу; беларуска-рускі і руска-беларускі машынныя слоўнікі [Совпель 2002: 8-10]. Распрацоўваецца лінгвістычная база дадзеных у выглядзе корпусу тэкстаў беларускай мовы. На жаль, да сённяшняга часу няма класічнага корпусу тэкстаў беларускай мовы з усімі яго атрыбутамі і дадаткамі, хоць праект машыннага фонду беларускай мовы быў прапанаваны яшчэ ў 1994 г. [Совпель 1994].

Інтэрнэт-рэсурсы беларускай мовы перадусім складаюць даведачныя і пошукавыя сістэмы (гл., напрыклад, беларускую версію пашукавіка Google.com), электронныя слоўнікі і энцыклапедыі (www.slounik.org). У сеціве створаны таксама сайт пра беларускую мову Pravapis.org (стваральнік – Ул. Каткоўскі / Rydel N 23; Эсмэральда). Рэсурс уключае беларускі лацінізатар, электронны арфаграфічны карэктар, перакладчык з транслiту, а таксама базу англамоўных і беларускамоўных артыкулаў пра беларускую мову і культуру.

## 2. Тры стыхіі беларускага Інтэрнэта

Для беларускага Інтэрнэт-дыскурсу магчымыя як мінімум чатыры варыянты тлумачэння сімвалу @: 1) *at* (*у / на*) – з англійскай мовы; 2) *сабака (сабачка)* – з рускай мовы; 3) *малпа* – з польскай мовы; 4) *слімак* – арыгінальная беларуская назва. Навідавоку карэляцыя: *сабакі* – з афіцыйным варыянтам сучаснай беларускай літаратурнай мовы (далей – СБЛМ), арыентаваным на рускую мову; *малпы* – з „інавацыйным" варыянтам СБЛМ, арыентаваным на *Беларускую граматыку для школ* Б. Тарашкевіча (Вільня, 1918), на польскую мову і заходнебеларускія гаворкі; *слімака* – з пурыстычнымі тэндэнцыямі, якія таксама вельмі выразна сёння выяўляюцца ў СБЛМ.

Такім чынам, нашая задача зводзіцца да высвятлення таго, чаго ў мове беларускага сеціва больш – *сабакі, малпы* ці *слімака.*

Беларускі Інтэрнэт – гэта па сутнасці лакмусавая паперка (люстэрка) той моўнай сітуацыі, што мае месца ў сучаснай Беларусі. Характарызуючы апошнюю, адзначым наяўнасць двух варыянтаў СБЛМ: **афіцыйнага (кадыфікаванага) і інавацыйнага (альтэрнатыўнага)**; паралельнае суіснаванне і нават „канкурэнцыю" [Мечковская 2003 :131] дзвюх правапісных сістэм: *тарашкевіцы* і *наркамаўкі*; а таксама традыцыйную для сучаснай Беларусі *трасянку.*

У артыкуле будуць разгледжаны моўныя асаблівасці беларускага інтэрнэтнага маўлення, а таксама асобныя найбольш выразныя тэндэнцыі, якія пры гэтым выяўляюцца.

Першая спроба задакументаваць гэтую цікавую з'яву належыць У. Каткоўскаму [Rydel N 23 2002], які ў сваёй працы прыводзіць багаты ілюстрацыйны матэрыял, у выніку аналізу якога сцвярджае нараджэнне новага „дыялекту", новай „гаворкі" – беларускага *netspeak'a*. Беларускі *netspeak* больш карэктна, аднак, было б называць не дыялектам ці гаворкай (ён не мае тэрытарыяльнага абмежавання), а сацыялектам – спецыяльнай мовай, якой карыстаюцца прадстаўнікі пэўнай сацыяльнай групы – насельнікі Байнэта.

У „віртуальнай" публікацыі С. Шупы [Шупа 2003] разглядаюцца праблемы ўтварэння беларускай камп'ютэрнай і інтэрнэтнай тэрміналогіі, а таксама праблемы стварэння камп'ютэрных праграм для беларускай мовы.

Матэрыял даследавання: тэксты, змешчаныя на старонках беларускамоўных Інтэрнэт-рэсурсаў: інфармацыйных сайтаў, сайтаў беларускамоўных газет і часопісаў, грамадскіх арганізацый, Інтэрнэт-бібліятэк; тэксты з беларускамоўных чатаў і форумаў (гл. вэб-спісы на <www.knihi.com>), а таксама матэрыял, прадстаўлены ў [Rydel N 23 2002].

## 3. Зона „BY”, або „Байнэт для беларусаў”: сацыялінгвістычны аспект

Як выглядае дынаміка пашырэння беларускай мовы ў сеціве? Калі прааналізаваць у колькасных адносінах Інтэрнэт-рэсурсы, створаныя на беларускай і рускай мовах, то ў зоне „BY” пераважаюць рэсурсы, зробленыя па-руску. Перадусім гэта тычыцца старонак большасці дзяржаўных органаў і ўстаноў Рэспублікі Беларусь, акрамя хіба толькі Міністэрства адукацыі і Міністэрства замежных спраў, што маюць свае старонкі і на беларускай мове. Асноўная частка беларускамоўных Інтэрнэт-рэсурсаў прыходзіцца на недзяржаўныя грамадскія арганізацыі (гл.: Міжнароднае грамадскае аб’яднанне „Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»”, Таварыства беларускай мовы, Міжнародная асацыяцыя беларусістаў, Згуртаваньне Беларускай Шляхты, Задзіночанне Беларускіх Студэнтаў, Беларуская асацыяцыя журналістаў, Фонд імя Льва Сапегі і інш.). Гл. вэб-спісы на *Беларускай палічцы* (<www.knihi.com>). Паводле [Кручкоў 2002], з 64 „грамадскіх” сайтаў, зарэгістраваных у вэб-каталозе *Акавіта* (<http:// akavita.by>), 35 з’яўляюцца беларускамоўнымі.

Стваральнікамі адпаведных рэсурсаў стала тое пакаленне беларускай моладзі, для якіх свядомы рамантычны выбар беларускай мовы (беларускай гісторыі і культуры) часоў Другога Беларускага Адраджэння стаў справай жыцця, а беларуская мова – мовай самаідэнтыфікацыі, навукі, культуры і сучасных ведаў.

Большая частка беларускамоўных рэсурсаў робіцца па-за межамі зоны „BY”. Вельмі часта стваральнікамі беларускамоўных сайтаў і старонак, што папулярызуюць беларускую мову, гісторыю і культуру, становяцца студэнты, што навучаюцца па-за межамі Беларусі. Адным з такіх рэсурсаў стала *Беларуская палічка* (<www.knihi.com>), на якой прадстаўлены пераведзеныя ў лічбавы фармат самыя разнастайныя беларускамоўныя крыніцы. Па сутнасці гэта адзін з найбольш поўных карпусоў тэкстаў беларускай мовы.

Размяшчэнне беларускамоўных рэсурсаў таксама ажыццяўляецца ў асноўным па-за межамі Беларусі (па эканамічных прычынах) – на серверах, паслугі якіх нашмат таннейшыя за беларускія.

## 4. Моўныя асаблівасці беларускага інтэрнэтнага маўлення

### 4.1. Фанетычны ўзровень

На фанетычным узроўні беларускаму *netspeak’y* уласцівы імітацыя жывой размовы „ў рэале”, перадача асаблівасцей маўлення на пісьме праз:

– выкарыстанне „трасянканізмаў” (або запазычанняў з рускай мовы ў беларускай фанетычнай абалонцы): *цысціраванне (тэсціраванне* або *тэставанне)*[1]*; шчас (зараз); нічаво (нічога); очань дажа (нават вельмі); дзелаць (рабіць);*

[1] У прыкладах захоўваецца арфаграфія цытуемых тэкстаў.

*унімацельна пасматрэць на этат вапрос (уважліва паглядзець на гэтае пытанне)* і інш.;

– „вымаўленне” асобных запазычанняў у стылі „а la трасянка”: *Інцярнет (Інтэрнэт); інцярфейс (інтэрфэйс)* і інш.;

– выкарыстанне фанетычных дыялектызмаў: *дзюрка (дзірка)* і інш., а таксама ў выпадках тыпу *ніхвіга (ніфіга), хвігець (фігець); пранцузы (французы), хвілязопія (філасофія),* дзе прасочваецца дыялектны ўплыў ці гіперкарэктнасць;

– выкарыстанне фанетычных паланізмаў і ўкраінізмаў: *мейсца (месца), альбум (альбом); шо (што)* і інш.

Адзначаныя з’явы непасрэдна звязаны з працэсам **калаквіялізацыі** (працэсам пераходу зніжаных элементаў (размоўных слоў і запазычанняў) з перыферыі моўнай сістэмы ў цэнтр). Параўн.: слова з беларускага *netspeak’a*: *шлюхаць (*кадыфікаваная норма: *слухаць); лядзець (глядзець); магёш (можаш); кул (*крута – ад англ. *cool).*

## 4.2. Графічны ўзровень

Досыць часта ў сеціве выкарыстоўваецца беларуская лацінка. На думку некаторых даследчыкаў, аднаўленню лацінкі мы мусім падзякаваць Інтэрнэту і мабільнай сувязі (сервісу SMS-паведамленняў).

## 4.3. Словаўтваральны ўзровень

На словаўтваральным узроўні беларускаму *netspeak’y* уласцівы:

– немарфемнае ўсячэнне як адзін з найбольш прадуктыўных спосабаў „інтэрнэтнага” словаўтварэння, што выклікана жаданнем эканоміць час пры наборы тэксту і „размаўляць” у сеціве хутчэй – як „у рэале”. Параўн.: *дзяк (дзякуй); зара (зараз); клява (клавіятура); комп (камп’ютэр).* Гэта тычыцца і асобных запазычанняў. Параўн.: *сабж (тэма* – ад англ. *subject);*

– размоўныя ўсечаныя формы тыпу *мо (можа); трэ (трэба); ё (ёсць); ма (няма); до (досыць); нат (нават); гэт’ (гэта)* і інш., дзе даследчыкі бачаць таксама і старажытныя формы (К. Гутшміт, А. А. Пацехіна);

– закон эканоміі моўных сродкаў („закон моўнае ляноты”) спрацоўвае і ў выпадку скарачэнняў тыпу *кл (калі ласка); у.н. (усяго найлепшага); чк (чакай); дп (да пабачэння)*; **ггг** – імітацыя рогату;

– калькі з русай і англійскай моў: *байнэт (беларускі Інтэрнэт); белнэт (беларускі Інтэрнэт); хатняя старонка (*параўн. з *хоўмпага* – ад англ. *home page);*

– наватворы і аказіяналізмы тыпу *сеціва* (С. Шупа); *гартач (*англ. *browser); гузік (button); тэчка (folder); пляткарня (чат); хамяк (хатняя старонка* – ад англ. *home page); пячорны (*гл. *ламэр); дабранак* (этыкетная форма развітання, калі суразмоўца ідзе спаць а 4–5 гадзіне раніцы; утворана па мадэлі этыкетнай „развітальнай” формулы *дабранач*) і інш.;

– абрэвіятуры (ці камп’ютэрныя скароты) вядомых устойлівых англамоўных канструкцый: *2u2 (To You To; табе таксама); afaik (As Far As I Know; наколькі я ведаю); btw (By the Way; між іншым, дарэчы); afk (Away From Keyboard; я зараз не за клавіятурай); asl (Age Sex Location; узрост, пол, месца знаходжання); h&k (Hugs & Kisses; абдымкі ды пацалункі); imho (In my humble opinion; на маю сціплую думку); brb (be right back; зараз (у хуткім часе) вярнуся; w8am (Wait A Minute; пачакай адну хвіліну)* і інш. Найбольш прадуктыўныя абрэвіятуры такога кшталту прадстаўлены ў [Rydel N 23 2002].

## 4.4. Лексічны ўзровень

На лексічным узроўні беларускаму *netspeak’y* уласцівы:

– працэс калаквіялізацыі: ужыванне размоўных, слэнгавых слоў з сецявога жаргону / слэнгу праграмістаў: *зырыць (‘глядзець’); фурычыць (‘працаваць’); замурочкі (*руск. *заморочки); аська (*ад англ. *ICQ = I seek you); мыла (пошта –* ад англ. *mail;); кракнуць (узламаць ліцэнзійную версію праграмы); спаміць (распаўсюджваць спам-рэкламу); баніць (забараніць уваход юзера на канал IRC); кікаць (выкінуць юзера з канала IRC); смайлік (‘усмешка’); лацініць (пераводзіць у лацінку* і інш.;

– запазычанні са славянскіх моў (польскай, рускай, украінскай і інш.): лексічныя паланізмы: *цо (што); бардзей (больш); ніц (нічога); ніж (чым); скрыдлы (крылы);* лексічныя ўкраінізмы: *вміць (умець); тылькі (толькі); рідны (родны)* і інш.;

– запазычанні з заходнееўрапейскіх моў, перадусім – англійскай: гэта ў асноўным камп’ютэрныя тэрміны або слэнг: *комэнты (каментарыі* – ад англ. *comment); хакер / гакер (*ад англ. *hacker); юзаць (карыстацца* – ад англ. *to use;); юзер (карыстальнік* – ад англ. *user;); ламэр (чалавек, што не ўмее карыстацца камп’ютэрам* – ад англ. *lamer), гэймер (фанат камп’ютэрных гульняў* – ад англ. *gamer); інэт / нэт (Інтэрнэт* – ад англ. *i-net;); спам (масавая Інтэрнэт-рэклама* – ад англ. *spam); крак (узламаная (пірацкая) версія праграмы* – ад англ. *crack); рэал (рэальнае жыццё* – ад англ. *real); канэкт (злучэнне* – ад англ. *connect); варэз (пірацкая неліцэнзаваная праграма* – ад англ. *warez); спэлчэкер (праграма, што правярае арфаграфію* – ад англ. *spellchecker)* і інш.;

– варварызмы (руска-/англамоўныя жарганізмы): *[Яна] рыхтуецца да таго, што яе ізноў поимеет той жа самы мужык; ... Асабліва прыкра тое, што і Бэрлін, і Брусэль плюнулі на Беларусь (што самі прызнаюць), паказалі 10 мільёнам маіх суродзічаў адзін вялікі dev/null.*

## 4.5. Граматычны ўзровень: марфалогія

– Імітацыя жывой „размовы ў рэале” праяўляецца і ў дзеяслоўнай парадыгме. Гл. „вымаўленне” дзеяслоўных постфіксаў у форме $V_f$ 2 ас. адз. ліку: *клапоцісься, рыхтуесься*. Параўн.: - *Пашто табе арабская? Ты для ЦРУ перакладаць рыхтуесься?*

– Значна больш шырокае ўжыванне маюць дзеясловы ў форме першай асобы множнага ліку з канчаткамі *-ма, -мо (будзьма, дамо, будуема; - Збудуема вэб-старонку, а потым палядзім...);* а таксама форм клічнага склону назоўнікаў м.р.: *браце, беларусе, сынку, Ясю.*

## 4.6. Граматычны ўзровень: сінтаксіс

Дастаткова рэгулярнымі на беларускамоўных вэб-старонках сталі апошнім часам **сінтаксічныя паланізмы і русізмы**.

Сінтаксічныя паланізмы найбольш выразна праяўляюцца:

– у мадэлях дзеяслоўнага кіравання: **чакаць на яго* (па аналогіі з *czekać na kogo-co*); **слухаць музыкі (słuchać czego); *вучыцца мовы (uczyć się czego); *шукаць патрэбнай кнігі (szukać czego); *пытаць аб аўтобус (pytać o co)* і інш. Параўн.: *Мы чакаем на вашыя лісты і водгукі; Здаецца, гісторыя нас нечага навучыла;...але я мог толькі зьдзіўляцца з таго, як...;*

– у асаблівасцях функцыянавання асобных беларускіх прыназоўнікаў – па аналогіі з іх польскімі адпаведнікамі: *3 лістапада будзе сорак дзён ад сьмерці Францоазы Саган – сусьветна вядомай французскай пісьменьніцы; ...Я ўжо столькі разоў бачыла яго шчасьлівым праз жанчыну...; Я ператвараюся ў сэрыйнага маньяка ад выданьня кніжак* (паэт А. Хадановіч пра сябе любімага)*;*

– часам запазычваюцца цэлыя ўстойлівыя канструкцыі або найбольш прадуктыўныя мадэлі, што складаюць базавы фонд нацыянальна-сінтаксічнай ідыяматыкі той ці іншай мовы: *Карацей, я не маю канонаў, што да алькаголю...* (параўн. з польск. *co do...*); *Нам часта закідаюць, што „Пяты канал” зрабіў рэвалюцыю ва Ўкраіне...* (параўн. з польск. *zarzucać komuś*).

Сінтаксічныя русізмы – гэта ў асноўным няўдалыя калькі з рускай мовы: *Яны рабілі ўсё магчымае, каб сапсаваць пляны...* (відаць, ад руск. *расстроить планы;* лепей: *расстроіць, разладзіць планы*); *распавядаць змовы ЦРУ...* (ад руск. *раскрывать* або *разоблачать;* лепей: *выкрываць*); *...у тэндэры прымалі ўдзел пяць кампаніяў...* (ад руск. *принимать участие;* лепей: *браць удзел*); *... аказваюць паслугі...* (ад руск. *оказывать услуги;* лепей: *рабіць паслугі*); *...прадстаўляюць сабой парушэньне...* (ад руск. *представляют собой;* лепей: *ёсць / уяўляюць сабой,* хоць таксама калька з рускай мовы); *...прыняць неабходныя меры...* (ад руск. *принять необходимые меры;* лепей: *рабіць / чыніць захады*); *спатрабаваў зь фірмы „БелОСТ” крэдыт...* (ад руск. *стребовать;* лепей: *спагнаў*).

## 4.7. Спецыфічныя асаблівасці Інтэрнэт-камунікацыі

Інтэрнэт, а таксама мабільная сувязь, арыентаваныя на хуткую, дакладную і аператыўную перадачу інфармацыі, абумовілі ўзнікнене **новага** – больш дэмакратычнага – **стылю пісьма**, які цалкам адпавядае дынаміцы сучаснай маладзёжнай субкультуры: хуткі, раскаваны, лёгкі, творчы эўрыстычны, арыгінальны, інфармацыйна ёмісты, месцамі жартоўны; тэматычна разнастайны (адсутнасць „закрытых” тэм).

На ўзроўні сінтаксісу гэта праяўляецца: у кароткіх абрывістых фразах, дакладнай рубрыкацыі тэкстаў; адмысловых жанрах (мэйл; „размова” у чаце; SMS-, MMS-, EMS-паведамленні), а таксама ў падкрэсленай эматыўнасці выказванняў.

У беларускім *netspeak'у* прысутнічае гульнявы пачатак. Моўная гульня, „свабодная словатворчасць масаў” – гэта якраз тое, што прыцягвае маладых людзей да маўлення на мове ў фармаце „інтэрнэтнае маўленне”, дзе яны „сваімі рукамі” могуць ствараць мову.

Выкарыстанне падчас інтэрнэтнага маўлення двух кодаў – кода натуральнай мовы і штучнага кода – яшчэ адна важная асаблівасць Інтэрнэт-камунікацыі. Прычым штучны код (напрыклад, сістэма смайлікаў тыпу :) – *'звычайная ўсмешка'*; :)) – *'падвойная ўсмешка'*; :( – *'незадаволены, сумны'*; :_( – *'плач'*); =) – *'шчаслівы, радасны'*; =/ – *'злы, раззлаваны'* і інш., што дазваляюць суразмоўнікам „выказваць” самыя разнастаўныя эмоцыі) часам больш важны для карыстальнікаў Інтэрнэта, чым арфаграфія, пунктуацыя і нават граматыка, што дазваляе казаць пра *ліберальна-дэмакратызуючае ўздзеянне* Інтэрнэта на натуральныя мовы [Мечковская 2005]. Яшчэ адной асаблівасцю жывога беларускага інтэрнэтнага маўлення з'яўляецца яго „трасянкавасць”. Здавалася б, што тут дзіўнага, калі асноўная частка насельніцтва Беларусі гаворыць на „беларускарускай мове” [Конюшкевич 2000], або трасянцы. Аднак мусім канстатаваць, што трасянка выконвае ў беларускім сеціве адмысловую ролю. У беларускамоўных чатах і форумах трасянка ўжываецца свядома, каб імітаваць „у рэале” жывое маўленне рускамоўных беларусаў. Гэта адзін з прыкладаў карнавалізацыі інтэрнэтнага маўлення, інтэлектуальнай карыкатуры, інтэлігенцкага культурнага сцёбу з той моўнай сітуацыі, што склалася на Беларусі (гл. дыялогі Сашы і Сірожы на Першым музычным канале і на „Альфа-радыё”, выказванні лідэра гурта „Ляпіс Трубяцкой” С. Міхалка, „Сабачыя гісторыі” В. Шніпа, якія прысвечаны „ўжо не дзеравенскім, але яшчэ не гарадскім хлопцам”.

## 5. Высновы

Мова беларускага *netspeak'а* досыць далёкая ад літаратурнага стандарту. Яна больш жывая нават у параўнанні з мовай такіх выданняў, як „Наша Ніва”, „Arche”, „Фрагмэнты”, „Студэнцкая Думка”, „pARTisan”, „Farba” і інш.

Найбольш істотнай асаблівасцю беларускамоўных Інтэрнэт-рэсурсаў з'яўляецца выкарыстанне ў іх пераважна **інавацыйнага варыянта** СБЛМ. Правапіс такіх рэсурсаў – у асноўным ***тарашкевіца***. У гэтым няма нічога дзіўнага. Насельнікі Байнэта (пераважна маладыя людзі) успрымаюць ***наркамаўку*** як старую, нягнуткую, ненатуральную сістэму vs. *тарашкевіцу* – як жывую, свабодную ад „умоўнасцей", адкрытую сістэму. Такім чынам, у вачах моладзі інавацыйны варыянт СБЛМ – больш прэстыжны ў параўнанні з афіцыйным варыянтам.

Увогуле выбар беларускай мовы ў якасці мовы Інтэрнэт-камунікацыі ў сітуацыі „камунікацыйна незбалансаванага" [Мечковская 2003 a: 38] квазідзяржаўнага двухмоўя, а таксама ў сітуацыі працяглага асіміляцыйнага рускага культурнамоўнага ўплыву з'яўляецца сапраўдным „czynem bohaterskim". Выбар беларускай мовы тут моцна маркіраваны. Яшчэ значна больш маркіраваным з'яўляецца выбар інавацыйнага варыянта СБЛМ і тарашкевіцы (тыя беларускамоўныя, што адносяць сябе да плыні „клясычнага" правапісу vs. тыя, што адносяць сябе да наркамаўкі [Шупа 2003]), што з'яўляецца знакам альтэрнатыўнасці афіцыёзу як у сацыяльным жыцці, так і ў мове, проціпастаўленасці існуючым нормам і правілам афіцыйнага (кадыфікаванага) варыянта СБЛМ, а ў апошні час – знакам падкрэсленай **элітарнасці**. Такім чынам, мусім канстатаваць змену акцэнтаў: на першы план выходзіць шляхетны, элітарны пачатак (= знак інтэлігентнасці, адукаванасці). Вырасла новае пакаленне маладых людзей, якія лічаць беларускую мову элітарнай, а сябе – беларускай элітай.

Галоўным рэпрэзентантам СБЛМ доўгі час была і застаецца мастацкая літаратура. Зараз да мастацкай літаратуры далучыўся і Інтэрнэт – яшчэ адзін канал камунікацыі, дзякуючы якому адбываецца пашырэнне аб'ёму камунікацыйнага прызначэння беларускай мовы. Тым больш, што ў сітуацыі „культурнай ізаляцыі" для пэўнай часткі людзей Байнэт – адзіная магчымасць размаўляць на роднай мове, а СБЛМ – рэальны сродак зносін, хоць і віртуальных.

У Інтэрнэце беларуская мова пачуваецца досыць вольна і гнутка. Сфера яе ўжытку з кожным годам усё больш пашыраецца. А гэта азначае, што яна паступова выходзіць з дэкаратыўнай-рытуальнай і побытавай сфер і, дзякуючы Інтэрнэту і мабільнай сувязі, „узрастаючае звужэнне камунікацыі на беларускай мове пасля рэферэндума 1995 г." [Мечковская 2003с: 126] паспяхова пераадольваецца, а працэс камунікавання на мове тытульнай нацыі выходзіць на якасна новы ўзровень.

Больш за тое, у інтэрнэтным маўленні, як і ў паэтычным тэксце, даволі моцная тэндэнцыя да ігнаравання / разбурэння (лібералізацыі) афіцыйных норм і да частковай іх замены інавацыйнымі варыянтамі, што маюць кантрастыўны характар у дачыненні да рускай мовы і да афіцыйнага варыянта СБЛМ, – варыянтамі, далёкімі ад рускамоўных, узятымі: 1) з моўнай практыкі 20-30-х гадоў XX ст. (лексіка Першага Беларускага Адраджэння); 2) з дыялектных крыніц (перадусім – заходнебеларускіх гаворак); 3) са славянскіх (польскай, украінскай і чэшскай) і германскіх (перадусім – англійскай) моў (працэсы запазычвання, а таксама калькавання слоў і ўстойлівых канструкцый). Відавочная пры гэтым

**дынаміка нормы СБЛМ** [Кіклевіч, Пацехіна 2000], што дазваляе казаць пра плюралізм нормы, якая існуе ў двух варыянтах: афіцыйным (кадыфікаваным) vs. інавацыйным. Тэндэнцыя да „адштурхоўвання” ад усяго рускага, якую можна лічыць у нейкай ступені праявай пурыстычнай тэндэнцыі (рэакцыя на моўную сітуацыю ў 50-80-я гады XX ст.), выразна праяўляецца і ў сеціве. Аднак у сваёй барацьбе з „усім рускім” радыкальная плыня не заўважае, як трапляе ў іншую пастку – пастку паланізацыі. А гэта ўжо чарговая крайнасць.

У вольных нетрах сеціва панаванню беларускай мовы нішто не замінае, таму ў Байнэце мы можам назіраць працэс натуральнага развіцця беларускай мовы.

Прычыны ўзнікнення шматлікіх варынтаў у СБЛМ, відавочна, звязаны з пошукамі яе носьбітамі (часцей за ўсё маладымі беларусамі) рацыянальных і натуральных крыніц і шляхоў яе развіцця. Адзначаныя вышэй сродкі запускаюць механізм натуральнага развіцця беларускай мовы, які доўгі час „штучна стрымліваўся жорсткімі нарматыўнымі рэгламентацыямі” [Арцямёнак 1994: 16].

Аднак ці азначае гэта „запавольванне” ў развіцці? У дачыненні да беларускай мовы мусім канстатаваць адваротнае. Пасля эпохі „летаргічнага сну” наяўнасць шматлікіх варыянтаў у СБЛМ сведчыць не пра заняпад беларускай мовы, а хутчэй пра яе абуджэнне (чытай – адраджэнне).

Чаго ж у мове беларускага сеціва больш – *сабакі*, *малпы* ці *слімака*? Мусім канстатаваць наяўнасць усіх элементаў (паралельнае суіснаванне двух варыянтаў СБЛМ, а таксама дзвюх правапісных традыцый; трасянкавасць; моцная пурыстычная традыцыя; шматлікія інавацыі польскага паходжання (гл. кваліфікацыю апошніх у [Кіклевіч, Пацехіна 2000; Kiklewicz 2002]) пры пэўным дамінаванні *малпы*.

Экзістэнцыя (быццё, а не існаванне) беларускай мовы – на памежжы традыцый, у зоне „паміж” (гл. [Мальдзіс 1997]), у моцнай апазіцыі да афіцыёзу як у грамадскім жыцці, так і ў мове. Гэта адпавядае агульнай тэндэнцыі быцця СБЛМ: спецыфіка, унікальнасць беларускай мовы ў яе **сінкрэтызме** (параўн. з канцэпцыяй *Беларуская літаратурная мова: паміж Slavia Orthodoxa і Slavia Latina* ў [Супрун 1999]).

## Библиография

Арцямёнак Г. (1994). *Лексічныя інавацыі польскага паходжання ў сучаснай беларускай літаратурнай мове*. W: *Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства. Мат-лы III Міжнар навук. канф.* Т 1. Віцебск, с. 13–16.

Кіклевіч А., Пацехіна А. (2000). *Беларуская літаратурная норма: дынаміка і інавацыі (па матэрыялах сучаснага беларускага друку)*. Slavia Orientalis. T. XLIX. № 1, s. 93–105.

Конюшкевич М.И. (2000). *Проблемы социума, говорящего на „белорусско-русском” языке*. W: *Язык и социум: Мат-лы III Междунар. науч. конф. (Минск, 4–5.12.1998 г.)*. Минск, с. 48–53.

Кручкоў С. (2002). *Роля грамадскіх арганізацыяў у стварэнні беларускамоўных электронных рэсурсаў*. W: *Беларуская мова. Інтэрнет і камп'ютэр / Матэрыялы „круглага стала” міжнароднага сімпозіума „Разнастайнасць моў і культур у кантэксце глабалізацыі” (Мінск, 20 мая 2002 г.)*. Мінск, с. 40–44.

Мальдзіс А. (1997). *„Памятайма, што мы заўсёды жылі і жывём на памежжы...”.* Народная газета (10 кастрычніка 1997 г.), с. 4.

Мечковская Н.Б. (2003a). *Языковая ситуация в Беларуси: Этические коллизии двуязычия* (1994). W: *Белорусский язык: социолингвистические очерки.* München, с. 21-46.

Мечковская Н.Б. (2003b). *Зачем одному народу две азбуки? (Кириллица и латинка в коллизиях белорусского возрождения)* (1998). W: *Белорусский язык: социолингвистические очерки.* München, с. 47–62.

Мечковская Н.Б. (2003c). *Языковая ситуация в Беларуси начала XXI в. Новые черты. Момент истины о белорусском суверенитете летом 2002 г.* W: *Белорусский язык: социолингвистические очерки.* München, с. 126–143.

Мечковская Н.Б. (2005). *Демократизация языков: факторы, коллизии и альтернативы.* W: Гл. гэты зборнік.

Совпель И.В. (1994). *Машинный фонд белорусского языка и его приложения (проект).* W: *Современные информационные системы и технологии.* Минск, с. 11–13.

Совпель И.В. (2002). *Лингвистические ресурсы белорусского языка и их приложения.* W: *Беларуская мова. Інтэрнет і камп'ютэр.* Мінск, с. 7–15.

Супрун А.Я. (1999). *Беларуская літаратурная мова: паміж Slavia Orthodoxa і Slavia Latina.* W: *Мова – Літаратура – Культура: Мат-лы Міжнар. навук. канф. (Мінск, 22-23.09.1998 г.).* Ч. 1. Мінск, с. 21–24.

Шупа С. (2003). *Software Localization in Belarus: Беларуская кампутарная і інтэрнэтная тэрміналёгія.* W: <http://pravapis.org/art_belarusian_mobile.asp>.

Kiklewicz A. (2002). *Język polski obojga narodów? Wpływ języka polskiego na język białoruskich mediów.* Język a komunikacja, s. 321–329.

Rydel N 23. (2002). *Netspeak – жывая мова нашага сеціва (Беларуская мова ў інтэрактыўным он-ляйне).* W: <http://pravapis.org/art_netspeak.asp>.

## SUMMARY

### The Belarusian language on the Internet

The results of research on such a phenomenon as „Belarusian netspeak”, and also some specific features of the Internet communications (elitism of the modern Belarusian language; emotivity of the Internet syntax; carnavalisation of the Bynet language etc.) are presented in this article.

Belarusian netspeak is a mirror reflection of that language situation that developed in Belarus on the turn of the 20th century.

Belarusian netspeak is far from the literary standard. The most essential feature of the Belarusian Internet resources is the use of an innovative variant of the modern Belarusian literary language: „tarashkevica” in basically used as a spelling system. There is nothing surprising in it. Users of Bynet (basically young men) perceive „narkamauka” as an old, nonflexible, artificial system vs. „tarashkevica” – alive, free from the „reserves”, open system. Thus, the innovative variant is more prestigious in comparison with the official one.

In general, the choice of the Belarusian language as the language of the Internet communications is strongly marked. Recently the Belarusian language is not only a sign of contrast to existing norms and rules of the official variant of the modern Belarusian literary language, but also a sign of the underlined elitism.

In Belarusian netspeak, as well as in the poetic texts, there is the tendency to liberalization: ignoring or even destructing official norms and partial replacement of them with innovative variants, of contrastive character to Russian and to the official variant of the modern Belarusian

language. The variants, far from Russian-speaking, are taken from: 1) the language practice of 20-30's of the 20th century (lexicon of the first Belarusian Revival); 2) dialectal sources; 3) other languages: Slavic (Polish, Ukrainian and Czech), German and (first of all) English). It is obvious that dynamics of the norm of the modern Belarusian language allows to speak about pluralism of the norm which exists in two variants: official (codificative) vs. innovative. The tendency to „pushing away" all possible Russian is in some way a manifestation of puristic tendency (the reaction on the linguistic situation in the 50-80's of the 20th century).

On the Internet the Belarusian language proves free and flexible. On the Internet we can observe the process of natural development of the Belarusian language.